# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ ПРАГРАМЫ ДЛЯ ПАСТУПЛЕННЯ НА ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**Спецыяльнасць 1-16 01 01 Кампазіцыя**

Відэазапіс выканання праграмы ў фармаце mp4. Запіс павінны быць прадстаўлены без відэа- і аўдыёмантажу працягласцю 15-20 хвілін з абавязковым выкананнем усіх патрабаванняў па спецыяльнасці, якія пазначаны ніжэй. Відэазапіс выканання праграмы прадастаўляецца ў выглядзе спасылкі на сайт www.youtube.com альбо на USB-flash-накапляльніку праз пасрэдніка.

| Праграма для паступлення на <u>падрыхтоўчае аддзяленне</u> да I курса | Праграма для паступлення на <u>падрыхтоўчае аддзяленне</u> да магістратуры |
|---|---|
| Паказ не менш 4-5 невялікіх твораў у розных жанрах (і тэхніках), пажадана для розных інструментаў (фартэпіяна, струнны інструмент, духавы інструмент, вакал). Перавага аддаецца творам з рознай эмацыйнай афарбоўкай. | Паказ 2-3 невялікіх камерна-інструментальных (трыо, квартэт, квінтэт) твораў, твораў для аркестра альбо ў вакальна-сімфанічным жанры. |
| Абавязкова павінен быць прадстаўлены нотны тэкст выкананых твораў. | |